УДК 82-313.2

***Антон Станіслававіч Папоў***
*магістр філал. навук, аспірант 2-га года навучання каф. беларускай філалогіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Anton Papou***
*Master of Philology, 2-year Post-Graduate Student of the Department of Belarusian Philology*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: avadon_10@mail.ru

# МАРАЛЬНА-ФІЛАСОФСКАЯ КАНЦЭПТУАЛЬНАСЦЬ І ТЫПАЛОГІЯ ГЕРОЯЎ У АПОВЕСЦІ А. АДАМОВІЧА «АПОШНЯЯ ПАСТАРАЛЬ» І РАМАНЕ Э. СКОБЕЛЕВА «КАТАСТРОФА»

*Артыкул прысвечаны комплекснаму параўнанню аповесці А. Адамовіча «Апошняя пастараль» і рамана Э. Скобелева «Катастрофа». На матэрыяле абодвух твораў разглядаюцца асноўныя элементы мастацка-філасофскіх канцэпцый А. Адамовіча і Э. Скобелева. Прыводзяцца прыклады супадзення і разыходжання стаўлення аўтараў да актуальных палітычных і сацыяльных праблем і шляхоў іх вырашэння. Параўноўваюцца погляды пісьменнікаў на прычыны гіпатэтычнай глабальнай ядзернай вайны, і выяўляюцца кропкі судакранання ў іх меркаваннях наконт магчымых крокаў чалавецтва па недапушчэнні разбуральнага канфлікта. Пры аналізе вобразаў галоўных герояў вызначаюцца іх характэрныя рысы.*

# Moral and Philosophical Conceptuality and Typology of Heroes in A. Adamovich's story «The Last Pastoral» and E. Skobeleu's Roman «Catastrophe»

*The article is devoted to a comprehensive comparison of A. Adamovich's story «The Last Pastoral» and E. Skobelev's roman «Catastrophe». The material of both works examines the main elements of the artistic and philosophical concepts of A. Adamovich and E. Skobelev. Examples of coincidence and divergence of points of view of authors on actual political and social problems and ways of their decision are resulted. It compares writers views on the causes of a hypothetical global nuclear war and reveals points of contact in their views on possible steps by humanity to prevent destructive conflict. When analyzing the images of the main characters are determined by their characteristics.*

## Уводзіны

У другой палове мінулага стагоддзя з'явілася шмат твораў, якія папярэджвалі пра небяспечнасць пачатку Трэцяй сусветнай ядзернай вайны. Прычыны гэтага хаваліся ў надзвычай напружанай палітычнай і ваеннай сітуацыі, якая неаднойчы за перыяд з 1946 па 1991 г. пагражала перарастаннем дыпламатычных супрацьстаянняў у паўнацэнны глабальны канфлікт. Таму пісьменнікі-мысляры розных краін намагаліся папярэдзіць чалавецтва аб тым, што вынікі практычна любога глабальнага канфлікта стануць фатальнымі для чалавецтва: выратаваць цывілізацыю будзе амаль немагчыма.

Паступова сярод пісьменнікаў, якія глыбока распрацоўвалі гэтую тэму, склалася пэўная мадэль стварэння падобных твораў. У іх найбольш ярка паказваліся наступствы ядзернай катастрофы для чалавека і прыроды, падаваліся шырокія пераканаўчыя апісанні разбурэнняў і страт сярод мірнага насельніцтва. Жыццё герояў ядзерных утопій канчаткова мяняецца ў момант Армагедону, і ім звычайна застаецца толькі ратаваць сябе ў бясконцай барацьбе, якая складае сутнасць постапакаліптычнага свету. Яшчэ адной прыкметай такой літаратуры з'яўляецца шырокае выкарыстанне прыёму «плыні свядомасці», што дазваляе рэцэпіенту прасачыць духоўнае развіццё ці падзенне герояў, ацаніць падзеі, іх прычыны і вынікі.

Мэта дадзенага артыкула – выявіць поле маральна-філасофскіх канцэптаў, агульнае для А. Адамовіча і Э. Скобелева, стварыць тыпалогію герояў «атамных утопій» абодвух пісьменнікаў і правесці між імі трывалыя паралелі.

---

*Навуковы кіраўнік – З. П. Мельнікава, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры беларускай філалогіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*

Задачы даследавання:

1) выявіць кропкі судакранання ідэйна-філасофскіх канцэптасфер твораў А. Адамовіча «Апошняя пастараль» і Э. Скобелева «Катастрофа»;

2) акрэсліць тыповыя характэрныя рысы герояў аналізуемых твораў і знайсці супадзенні у іх функцыянальным і маральна-філасофскім напаўненні.

Найбольш вядомай беларускай атамнай утопіяй, безумоўна, з’яўляецца «Апошняя пастараль» А. Адамовіча. Аднак на некалькі гадоў раней за названы твор з’явіўся раман «Катастрофа» Э. Скобелева, які, нягледзячы на значна меншую вядомасць сярод масавага чытача, уяўляецца таксама прыкметным творам гэтага жанру. Для нас раман Э. Скобелева цікавы яшчэ і тым, што менавіта А. Адамовіч напісаў да яго вельмі яркую, публіцыстычна завостраную прадмову, без якой «Катастрофа» шмат бы страціла ў сваім уздзеянні на патрабавальную чытацкую аўдыторыю. Ва ўступным слове Алесь Міхайлавіч гаворыць пра значнасць твора Э. Скобелева для выратавання чалавецтва ад рукатворнага апакаліпсісу: «Об этом написал, об этом решился написать Эдуард Скобелев (дальше у него – жизнь нескольких случайно спасшихся в суперубежище) со всей, сегодня нам доступной, жестокой правдой воображения – не щадя ни себя, ни читателя. Только такой и может быть честная, нужная литература о невообразимом. Только такой, потому что ее задача – подвигнуть на действия» [1, с. 2].

Аб значнасці праблематыкі гэтага твора слушна пісала гарадзенская даследчыца Л. І. Мурзіч: «Страшная правда о ядерной войне в центре внимания автора «Катастрофы». Писатель-философ предупреждает не только об опасности атомной войны, но и размышляет о современности» [2, с. 11].

«Катастрофа» Скобелева – твор, сюжэт якога нельга назваць лінейным. Усю першую палову тэкста мы бачым перад сабой, на першы погляд, нешта падобнае да прыгодніцкага этнаграфічнага рамана пра насельнікаў-меланезійцаў выдуманай краіны Атэнаіты. Аднак апісанні перыпетый мясцовай палітыкі і пастаральных пейзажаў ціхаакіянскага вострава рэзка змяняюцца карцінай сусветнай катастрофы, распаду чалавечага грамадства і знікнення маралі.

У цэнтры ўвагі пісьменніка-філасафа – жудасная праўда пра прычыны і наступствы ядзернай вайны. «Катастрофа» – гэта не толькі раман-папярэджанне, але і творроздум пра сучаснасць. Падзеі, якія разгортваюцца перад чытачом, паўстаюць у рэальнасці, максімальна набліжанай да сучаснай. Гэта не далёкая будучыня і не абстрактны свет, а адбітак сённяшняга часу на старонках рамана. А. Адамовіч у фінальнай частцы ўступа да «Катастрофы», пісаў так: «Роман “Катастрофа” обращается к самым насущным проблемам нынешней жизни. Это позволяет надеяться, что правда о нежелательной, страшной, осужденной всем мыслящим человечеством перспективе, изображенная в романе, будет воздействовать повсюду» [1, с. 7]. Палітычныя і сацыяльныя ўмовы існавання грамадства максімальна набліжаныя да рэалій часу, калі быў створаны раман. 80-я гг. ХХ ст. характарызуюцца паталагічнай падазронасцю і нават нянавісцю ў дачыненні да камуністычнай ідэалогіі і сацыялістычных краін сярод уплывовых палітычных эліт свету. Назіраецца актыўнае ўмяшанне ЗША ва ўнутраныя справы дзяржаў трэцяга свету, узмацняецца адчуванне небяспекі атамнага апакаліпсісу. Падобныя трагічныя і драматычныя моманты тагачаснай рэальнасці лёгка адгадваюцца ў сюжэце «Катастрофы». Гэтым раман, дарэчы, адрозніваецца ад «Апошняй пастаралі» А. Адамовіча. Відавочна, што Э. Скобелеў абвінавачвае ў ядзерным канфлікце толькі адзін бок, а менавіта – амерыканскіх імперыялістаў. А. Адамовіч папярэджвае аб калектыўнай адказнасці ўсяго чалавецтва за сваю будучыню. Ён гаворыць увогуле пра небяспеку існавання абедзвюх сістэм, не аддаючы прыярытэт ні адной з іх.

Пры глыбокім супастаўляльным аналізе бачны цэлы шэраг сутнасных прыкмет, якія супадаюць і ў аповесці А. Адамовіча, і ў рамане Э. Скобелева. Так, «Катастрофу» мы можам аднесці да таго ж жанру «атамнай утопіі», што і «Апошнюю пастараль». Абодва аўтары-мысляры стварылі творы аб непажаданай будучыні, наследуючы традыцыі Я. Замяціна і найбольш аўтарытэтных антыўтапістаў-замежнікаў накшталт Р. Мёрля, Дж. Уіндэма, Р. Брэдберы і г. д.

Абодва творы маюць вельмі моцны выразна-пастаральны элемент. Скобелеўскі эпізод з візітам этнаграфічнай экспедыцыі, у якую ўваходзіць і галоўны герой Фром, правадыр меланезійскага племені, напрыклад, утрымлівае ў сабе цэласныя і маляўнічыя апісанні прыроды Атэнаіты і родніць раман з «Апошняй пастараллю» (табліца 1).

Табліца 1. – Апісанні прыроды

| А. Адамовіч «Апошняя пастараль» | Э. Скобелеў «Катастрофа» |
|---|---|
| Воды хватает как раз на сутки: она гладко, как светлое масло, опоясанное радугой, выливается сквозь широкую щель и каменно-громко падает на чуть скошенную скалу [3, с. 9]. | Какой был воздух! Какая тишина! Как умиротворенно светили звезды! Я не сомневался, что хогуни, жители Канакипы, – самые счастливые на свете… И точно, вступив на поляну, где эвкалипты и пальмы окружали десятка два хижин, мы увидели старуху, кучку голопузых детишек и собак, которые в отличие от европейских не заливались глупым лаем. Чуть в стороне от хижин под широкими листьями банана нежились, похрюкивая, серые, длиннорылые свиньи. Возле них ходили мелкие куры [1, с. 20–22]. |

Аўтары выкарыстоўваюць насычаныя дэталямі апісанні, падкрсліваючы яшчэ і аднаўленне прыроды, якая ці не эксплуатуецца больш чалавекам («Апошняя пастараль»), ці існуе з ім у гармоніі («Катастрофа»).

Яшчэ адна характэрная асаблівасць абодвух твораў – выяўленне агульнага настрою, эмоцый герояў, сэнсу будучых падзей. У пастаральныя пейзажныя замалёўкі і А. Адамовіч, і Э. Скобелеў уключаюць сімвалічныя, папераджальна-трывожныя элементы (хмарныя навальнічныя сцены вакол вострава, жоўтыя кветкі, няправільны ход Сонца ў «Апошняй пастаралі», навальніцы і трапічныя дажджы, якія суправаджаюць усе пераломныя моманты ў «Катастрофе»).

Трансфармацыі пастаральнай ідылічнасці ў аповесці А. Адамовіча няяўныя. Паступовы пераход пастаралі ў дыстопію на старонках «Апошняй пастаралі» адбываецца са з’яўленнем Трэцяга.

У рамане Э. Скобелева гэты пераход больш рэзкі. Адбываецца ён у эпізодзе з вечарынай у Герасты, дзе знешне прыстойны і нават арыстак-ратычны бамонд Атэнаіты пераўтвараецца ў банду распуснікаў. Безумоўна, найбольш сімвалічна выглядае эпізод са спойваннем і прымусам да інтымнай сувязі мясцовых жыхарак-меланезіек: «Меланезийки были печальны, но, опьянев, согласились потанцевать. И все мужчины тоже танцевали, обнажившись до пояса. По углам курили марихуану. Предстояли оргии. Кое-кто уже начал выбираться из зала» [1, с. 32].

На нашую думку, гэты ўрывак увогуле адзін з самых паказальных эпізодаў твора. У ім мы бачым, як распусныя прадстаўнікі нібыта вышэйшай амерыканскай і еўрапейскай культуры непапраўна разбураюць мараль прадстаўнікоў культуры Атэнаіты, больш багатай і кансерватыўнай.

Увогуле малюючы карціны паступовага знікнення плямён, якія жылі на землях вострава са старадаўніх часоў, у прыватнасці, у легендзе пра Эгаціарэ і эпізодзе з п’янымі меланезійцамі, чый сэнс жыцця цяпер толькі ў бяскантрольным ужыванні спіртных напояў, Э. Скобелеў падкрэслівае разбуральны, дэструктыўны характар сучаснай цывілізацыі, якая знішчае не толькі сама сабе (што ў выніку прыводзіць да планетарнай катастрофы), але і цягне за сабою народы, якія да нядаўніх часоў жылі асобна і мелі традыцыйны ўклад жыцця.

У пейзажных замалёўках з аповесці і рамана важную ролю адыгрываюць асобныя элементы, якія дазваляюць ствараць той ці іншы настрой у чытача, канцэнтраваць яго на галоўнай тэме твора ці на асобных яе аспектах (табліца 2).

Табліца 2. – Дэталізаваныя пейзажныя замалёўкі

| А. Адамовіч «Апошняя пастараль» | Э. Скобелеў «Катастрофа» |
|---|---|
| Наши стройные березки, под которыми мы готовим себе обед, где и сейчас вьется легкий дымок, семена свои разбрасывают опасливо: кое-где проросли молодые зеленые ростки, тянутся из каменных расщелин, но желтые монстры-цветы тут как тут, прямо-таки наваливаются на них, теснят, душат [3, с. 3]. | Лошади выбились из сил, поскольку путь то и дело преграждали ямы, рытвины, камни, поваленные стволы деревьев, языки хлипкого черного болота. Полумрак под сводами буйной растительности и безжалостные укусы комаров угнетали меня: я даже пожалел, что отправился в путешествие [1, с. 21]. |

Для абодвух пісьменнікаў, як бачна з прыведзеных урыўкаў, характэрна выкарыстанне апісання стану жывой прыроды, раслін для таго, каб падкрэсліць трывожнасць герояў, перадаць прадчуванне небяспекі: хутка можа здарыцца ці канчатковая, яшчэ большая бяда (па А. Адамовічу), ці пачнецца першы акт ядзернай вайны (па Э. Скобелеву).

Знешне пастаральныя пейзажы змяшчаюць у сабе па-майстэрску схаваныя элементы, якія не дазваляюць чытачу аслабіць увагу, упусціць агульны настрой і сэнс абодвух твораў.

І аповесць, і раман шматлікія даследчыкі называюць творамі-папярэджаннямі. Галоўная іх ідэя – не дапусціць развязвання Трэцяй сусветнай вайны ў фармаце ядзернага канфлікта. Як адзначаў сам А. Адамовіч ва ўступным слове да рамана, і яго мэтай, і мэтай Э. Скобелева было «Взрывать “бомбу” в сознании – против бомбы реальной. Жестоко-правдиво описывать катастрофу во имя того, чтобы она отодвинулась, не наступила» [1, с. 2]. Пры гэтым абодва пісьменнікі маюць падобныя погляды на прадухіленне катастрофы. Рэцэпт гэты адначасова вельмі просты і амаль невырашальна складаны – патрэбна адрадзіць мараль грамадства, вярнуць чалавеку павагу да іншых, выкараніць зайздрасць, хціўсаць, вярнуць традыцыйныя каштоўнасці сям’і – вернасць, каханне. Пры гэтым адну з найбольш важных ролей адыгрываюць нават не самі рэкамендацыі чалавецтву, а канстатацыя праблемы, яе публічнае фармуляванне ўслых. Найбольш выразна, хоць і метафарычна, прычыны апакаліпсісу выкрываюць героі, якія раней за ўсіх усвядомілі сэнс падзей, якія адбываюцца з сусветам: Жанчына у «Апошняй пастаралі» і партызан-філосаф Ока-Ома ў «Катастрофе»:

Табліца 3. – Прычыны ядзернай вайны паводле ўяўленняў герояў твораў

| А. Адамовіч «Апошняя пастараль» | Э. Скобелеў «Катастрофа» |
|---|---|
| Значит, вас было не шесть миллиардов, а три раза по шесть. Нет, больше: там еще и команды. Теперь понятно, почему никак не могли ужиться. Если в себе никакого мира, какой же – с другими? [3, с. 30]. | У меланезийцев есть такая легенда: ребенок, увидев в лагуне отражение луны, потребовал, чтобы «это» дали ему в руки. Вождь сказал: «Важнейшее в воспитании – научить, чтобы каждый просил только то, что может получить». Увы, человечество напоминает то же дитя: его волнует отражение и не заботит сущность… [1, с. 58]. |

Выразна бачна, што і Марыя, і Ока-Ома намагаюцца растлумачыць сэнс глыбінных прычын ядзернай катастрофы, сказаць аб гэтым громка і ўслых. Адсутнасць згоды паміж людзьмі і адкрытае ігнараванне гармоніі з прыродай, па меркаванні абодвух пісьменнікаў, таксама важныя складнікі будучай катастрофы. Гіпатэтычны ядзерны канфлікт разглядаецца імі не як нейкая спантаная з’ява, а як працэс, які падрыхтоўваецца спакваля, і для некаторых з’яўляецца нават жаданым выйсцем з цывілізацыйнага крызісу. У «Апошняй пастаралі» гэта ідэя амаль не агучваецца, аднак у эпізодзе, у якім Трэці ўпершыню бачыць жалезныя дзверы за вадападам, прачытваецца ідэя застарэлай нянавісці да таго, каму быў бы выгодны глабальны атамны канфлікт:

– А, крысы штабные, вот вы где!

Постучал камнем по железу.

– С победой, мерзавцы! Доигрались, черви зеленые? [3, с. 19].

У Э. Скобелева гэтая тэма распрацавана нашмат больш шырэй – вобраз амеры-

канскага дыпламата Сэлмана цалкам падпарадкаваны выкрыццю антычалавечых ідэй глабальнага капіталізму. Праграма «развіцця», якую навязвае імперыяліст народу Атэнаіты, з’яўляецца аб’ектам выкрыцця на працягу ўсяго твора. Выкарыстоўваючы эканамічныя схемы, палітычны ўціск, добра ўзброенных наёмнікаў, ён гатовы ператварыць людзей, якія жывуць на востраве, у бяспраўных рабоў, «манкуртаў» па тэрміналогіі Ч. Айтматава [4], замяніўшы алкаголем і наркотыкамі іх непаўторную культуру. Сэлман – прыхільнік кардынальнага вырашэння з дапамогай масавых забойстваў праблем чалавецтва. Менавіта з яго вуснаў гучаць найбольш страшныя, антыгуманістычныя сентэнцыі. Напрыклад: «В тотальной войне, которую мы ведем, все средства хороши. И чем дешевле, тем лучше. Разработана простая методика использования нервно-паралитических газов при любой погоде. Паралич дыхательных путей и полная слепота. Поражаемость – девяносто процентов…» [1, с. 110]. Сэлман спакойна, нават з адчуваннем уласнай вартасці гаворыць пра выкарыстанне нервна-паралітычных газаў супраць мірных пратэстоўцаў, лічыць атамную бомбу натуральным сродкам для змяншэння насельніцтва Зямлі. У гэтым вобраз Сэлмана нагадвае вобразы гітлераўскіх карнікаў Цымермана і Дзірлевангера з аповесці А. Адамовіча «Карнікі». Ідэі амерыканскага пасла практычна цалкам паўтараюць гіпербарэйскія антычалавечыя прынцыпы карнікаў, заснаваныя на ніцшэанскіх ідэях. Негатыўным паўстае ў гэтым кантэксце і вобраз дыктатара Атэнаіты Такібае, які, нягледзячы на дэклараванне дэмакратычных ідэй, застаецца па-сярэднявечнаму жорсткім уладаром:

Табліца 4. – Параўнанне поглядаў Адольфа Гітлера і дыктатара Атэнаіты Такібае

| Адольф Гітлер, «Карнікі» | Такібае, «Катастрофа» |
|---|---|
| Времени – вот чего не хватает. Чтобы из сырья человеческого, которое нам оставила история, из этого мусора рас выплавить чистую сталь новой расы, нового человека [5, с. 5]. | Мы ограничим рождаемость, введя налог на ребенка. Мы займемся проблемой породы, иначе говоря, генетическим улучшением человека… [1, с. 48]. |

Як бачна з табліцы-супастаўлення, ідэі абодвух дыктатараў практычна ідэнтычныя. Абапіраючыся на антынавучны сацыял-дарвінізм, Гітлер і Такібае выяўляюць сябе як надзвычай небяспечных і непрадказальных лідараў, якія не спыняцца перад мільёнамі ахвяраў для дасягнення сваіх мэтаў.

Яшчэ адной кропкай судакранання абодвух твораў з’яўляецца наяўнасць матываў «рабінзанады». Прамых спасылак менавіта на бессмяротны твор Д. Дэфо ў «Апошняй пастаралі» няшмат. Дакладней, яна толькі адна: «Она в голубом, он в розовом, ну а я – чем бы и мне опоясаться? Бреду сзади, как Пятница, но ведь и он не гулял в чем мать родила» [3, с. 25]. Спасылка гэта, на нашу думку, носіць выразна парадыйны характар. Жанчына яшчэ не адвярнулася канчаткова ад Першага, аднак усе прыкметы гэтага ёсць: яна значна больш прыязна ставіцца да Трэцяга, прымае падарункі, носіць яго адзежу. Герой жа цяпер становіцца лішнім і брыдзе за новай парай, як Пятніца за Рабінзонам. Адсутнасць на ім хоць якой адзежы падкрэслівае безабароннасць і немагчымасць штосьці змяніць. Камічнасць гэтага моманту заключаецца яшчэ і ў тым, што Трэці таксама не становіцца Рабінзонам. Такім чынам, баланс класічнай пары «Рабінзон – Пятніца» парушаецца, што вядзе да стварэння камічнага эфекту.

Матывы гэтыя ёсць і ў рамане Э. Скобелева. Выяўляюцца яны ў двух эпізодах. У першым з іх бессмяротны твор Д. Дэфо ўзгадвае Ока-Ома, разважаючы пра ролю народнага паэта Эгаціарэ: «Увы, белым людям были безразличны наши страдания. Они не понимали и не хотели понять нас. Мы представляли для них разве что этнографический интерес. Каждый из нас, темнокожих, был безгласным Пятницей при Робинзоне» [1, с. 38]. Ужываючы метафару Рабінзона і Пятніцы, герой рамана тлумачыць пісьменніку Фрому становішча на востраве мясцовага насельніцтва, якое стагоддзямі знаходзілася пад прыгнётам каланізатараў. Падобна да таго, як палонны людажэр Пятніца ў першы перыяд свайго знаёмства з Рабінзонам выклікае больш этнаграфічную і этнакультурную цікавасць, так і меланезійцы з Атэнаіты для белых калані-

затараў не больш, чым рабы і матэрыял для даследавання. Зносіны Рабінзона і Пятніцы з рамана Д. Дэфо Э. Скобелеў разглядае як негатыўныя, паколькі Рабінзона ён бачыць разбуральнікам непаўторнай культуры дзікуноў і прычынай іх фізічнага вынішчэння.

Іншую ідэю, больш класічную ў дачыненні да твора-арыгінала, Э. Скобелеў выяўляе ўжо ў канцы рамана, дзе з праблемай Рабінзона, які застаўся адзін на сваім востраве, сутыкаецца ўжо пісьменнік Фром пасля гібелі Луіі і забойства Гартэнзіі: «Вспомнив, что полураспад каких-то изотопов будет продолжаться сотни лет и что еще годы будут сыпаться с неба радиоактивные осколки, я подумал, что, может быть, мне, новоявленному Робинзону, когдалибо придется еще сеять хлеб и редьку, используя запасы семян» [1, с. 188]. Звар'яцелы галоўны герой атаясамлівае сябе з Рабінзонам, які павінны зрабіць свой востраў прыдатным для жыцця. У гэтым вобразе, акрамя рабінзонаўскіх, прагледжваюцца яшчэ і рысы язычніцкіх багоў-сейбітаў, якія выхадзілі на пашу, каб засеяць яе новымі людзьмі пасля мясцовых варыянтаў лакальных апакаліпсісаў.

Канцэпцыя другой часткі рамана Э. Скобелева практычна ідэнтычная аповесці А. Адамовіча. Любоўны трохкутнік у «Апошняй пастаралі» складаецца с двух мужчын і адной жанчыны. Такая ж мадэль герояў і ў «Катастрофе» – дзве жанчыны і адзін мужчына. Пры гэтым канцэпцыя, паводле якой будуюцца ўзаемаадносіны герояў, якія знаходзяцца ў ізаляцыі, падобная: матывы рэўнасці, суперніцтва прачытваюцца ў абодвух творах.

Параўноўваючы мужчынскія вобразы, лёгка знайсці кропкі судакранання, хаця пры неглыбокім аналізе здаецца, што героі вельмі адрозніваюцца: пісьменнік-філосаф і камандзір падводнай лодкі – людзі з рознымі біяграфіямі і непадобнымі поглядамі на жыццё.

Па-першае, героі эвалюцыянірують на працягу ўсяго твора, прычым змены, якія з імі адбываюцца, у асноўным негатыўныя. Пісьменнік Фром, які спачатку здаецца чытачу інтэлектуалам, філосафам-мысляром, пазней паступова пераўтвараецца ў пешку ў гульні «вялікіх гэтага міру», а потым і ў забойцу. Маральнае падзенне яго, на першы погляд, у сваёй аснове мае знешнюю прычыну – раптоўны пачатак атамнай вайны. Аднак на самой справе Фром прыходзіць да гэтага паступова. Спачатку ён захапляецца дыктатарам Такібае, потым дазваляе лупцаваць сябе наймітам, затым скатваецца ў вечную дэмагогію, праз якую ўжо ідзе да страты розуму, маўклівага згодніцтва забойства Луіі і жудаснай расправы над Гартэнзіяй.

Тэорыя шматадсечанасці чалавека, якую падае А. Адамовіч у «Апошняй пастаралі», таксама можа быць прыменена і ў дачыненні да галоўнага героя «Катастрофы» Э. Скобелева – аўстрыйскага пісьменніка Фрома. У яе аснове – меркаванне А. Адамовіча пра неаднародную прыроду чалавека, для паводзінаў якога на розных этапах жыцця і ў розных жыццёвых абставінах характэрныя выяўленні цэлага шэрагу тыповых прыкмет. Паслядоўнасць этапаў выглядае так: «тут і цяпер» (характарызуецца ўстойлівым жаданнем атрымаць «усё і адразу»), «чадалюбец» (характарызуецца гіпербалізаванай любоўю да дзяцей і гатоўнасцю пайсці за іх да канца), «ідэолаг» (характарызуецца гіпербалізаванай ідэалагізаванасцю ўсіх аспектаў жыцця, сляпым і ваяўнічым дагматызмам), «баязлівец» (характарызуецца страхам за жыццё і гатоўнасцю на самыя жудасныя злачынствы з-за яго). Пры гэтым сутнасным элементам канцэпцыі шматадсечанасці А. Адамовіч называе ўзровень небяспекі для іншых людзей у залежнасці ад таго, на якой стадыі знаходзіцца такі шматадсечаны чалавек.

Фром, прыязджаючы ў Атэнаіту, праходзіць этап «тут і цяпер» – яго часовыя межы мы можам абазначыць як час ад прыбыцця на востраў да этнаграфічнай экспедыцыі ў глыбіню яго тэрыторыі. Другая стадыя – «чадалюбец» – выяўляецца ў сцэнах ваяжу па востраве ў суправаджэнні Ока-Ома. Пры гэтым яна трансфармуецца ў любоў да мясцовых жыхароў, якія, па меркаванні галоўнага героя, жывуць у гармоніі з прыродай і з'яўляюцца яе сапраўднымі дзецьмі: «Черт возьми, подумалось мне, если эти милые дети природы существуют, не сжимаясь в стальную спираль, не участвуя в тотальной борьбе и подлых махинациях, значит, они истинно живут» [1, с. 23]. Між тым, «чадалюбства» ў Э. Скобелева не напружанае, не трагедыйнае – яго герой ведае перавагі жыцця меланезійцаў і белых

людзей, не вырашаючы пытанне радыкальна на карысць тых ці іншых.

Стадыі «ідэолага» і «баязліўца» ў А. Адамовіча даволі рэзка размежаваныя, і нават непадрыхтаваны чытач можа заўважыць гэты пераход. У «Катастрофе» два апошнія, найбольш небяспечныя «адсекі» зліваюцца фактычна ў адзін, прычым з пераменнай дамінацыяй то аднаго, то другога напрамку. Спачатку, адразу пасля ядзернага выбуху, Фром увогуле страчвае здольнасць да мыслення. Аднак потым, прызвычаіўшыся да жыцця ў бункеры, ён змагаецца за жыццё, даходзячы ў стадыі «баязліўца» да здрады Луіі і забойства Гартэнзіі. Затым, у стадыі «ідэолага», стварае месіянскі культ імя самога сабе. Дарэчы, своеасаблівыя ўяўленні аб будучыні Зямлі і тым, што трэба рабіць для выжывання чалавецтва, характэрныя і для Першага, і для Фрома. Абодва адчуваюць сябе месіямі, выратавальнікамі, у руках якіх лёс будучыні чалавецтва:

Табліца 5. – Параўнанне ўяўленняў Фрома і Першага пра сваю місію па выратаванні чалавецтва

| А. Адамовіч «Апошняя пастараль» | Э. Скобелеў «Катастрофа» |
|---|---|
| Если он то, что я узнал, значит, в данной ситуации представляет лишь самого себя, особь. Я же представляю род человеческий. Ну хотя бы возможность его в будущем [3, с. 45]. | Я, пророк Фромм, утверждаю [1, с. 183], ці Отныне я знал, что мне делать – исполнить предназначение. Наконец-то исполнить [1, с. 185], ці Я был властелином мира, и все, кто уцелел, обязаны были броситься к моим ногам, с благодарностью принять мою опеку и мое слово [1, с. 189]. |

Выразна бачна, што і Першы, і Фром у выніку сваіх разважанняў над сваім лёсам і лёсам чалавечай цывілізацыі прыходзяць да памылковай і нават вар'яцкай высновы аб выключнай ролі саміх сябе ў выратаванні планеты.

Увогуле, матывы месіянства гучаць у абодвух творах. І Першы, і Фром толькі пасля катастрофы пачынаюць адчуваць сваю адказнасць за чалавецтва і намагаюцца выратаваць хаця б апошніх людзей. Пры гэтым у Э. Скобелева мы бачым, як галоўны герой паступова становіца вар'ятам; гэтым падкрэсліваецца не толькі яго псіхалагічны стан, але і дыягназ усяму чалавецтву, якое ў сваім цывілізацыйным асляпленні забіла і сябе, і планету.

Параўноўваючы вобразы з «Катастрофы» і «Апошняй пастаралі», немагчыма не закрануць галоўныя жаночыя персанажы – Марыю і Луію. Прыгожая меланезійка, палюбоўніца дыктатара Такібае і адначасова партызанская разведчыца Луія, нягледзячы на сваё паходжанне, мае філасофскі склад розуму, востра адчувае несправядлівасць чалавечай цывілізацыі. Яе погляды на жыццё заснаваныя на гуманістычнай філасофіі, яна цэніць жыццё і заклапочана небяспекай, якую сам чалавек уяўляе для самога сябе і для Зямлі. Яна дае цвярозую і ўзважаную ацэнку таго, што адбылося, з агульначалавечых пазіцый: «Три человека не могут поладить между собой, располагая всеми необходимыми для существования средствами, – как же могли поладить народы, которых разделяла и нищета, и обиды истории, и политические споры, и материальные интересы?» [1, с. 147]. Характэрнай рысай вобраза Луіі з'яўляецца і яе заклапочанасць аб буду-чыні чалавецтва: «Нет большего горя, если человечество выйдет в космос разобщенным» [1, с. 155]. Бяспеку чалавецтва яна ставіць у якасці галоўнай умовы паступальнага развіцця, неабходнай для ўзыходжання на новыя ступені эвалюцыі цывілізацыі, якія будуць якасна адрозніваца ад таго, што мы бачым сёння.

Значэнне вобразаў Луіі і Марыі для галоўных герояў абодвух твораў надзвычай вялікае. Жанчыны выяўляюцца не толькі як аб'ект кахання з боку галоўнага героя (адкрытага ў герояў А. Адамовіча і схаванага ў герояў Э. Скобелева), але і як аб'ект захавання надзеі. Менавіта яны не даюць героям уступіць у апошні канфлікт, які скончыцца канчатковым апакаліпсісам. І менавіта пасля іх гібелі знікае і надзея на выратаванне чалавецтва. Так, смерць Марыі пасля купання ў радыяктыўным акіяне сімвалізуе канец чалавецтва, бо апошняя жанчына, якая насіла дзіцё і магла адрадзіць цывілізацыю, раптоўна гіне. Адразу ж пасля гэтай сцэны мы бачым фінал «Апошняй пастаралі», дзе амерыканскі арбітальны бамбардзіроўшчык і савецкая падводная лодка адна-

часова расстрэльваюць апошняе незакранутае вайной месца на планеце.

Забойства Гартэнзіяй Луіі, хоць і хранаграфічна далёкае ад заканчэння твора, таксама сімвалізуе непазбежнасць канца. Смерць меланезійкі маральна забівае Фрома, а праз яго і ўсё чалавецтва, пазбаўляе яго аднаго з апошніх смелых мысляроў-гуманістаў, якога мы бачым у вобразе гэтай цёмнаскурай жанчыны: «Смерть Луийи, казалось бы ничтожное в сравнении с другими событие, сбила меня с курса. Я растерян, раздавлен, не проходит ощущение, будто я забыл что-то очень важное и мне никогда не вспомнить… Благодаря Луийе сохранялось равновесие. И вот – его нет, и зреет новое преступление…» [1, с. 171]. Для Фрома Луія, якая здолела нават у экстрэмальнай сітуацыі захаваць мужнасць і вытрымку, была «последним счастьем посреди растерзанного мира» [1, с. 165], якое жорсткі і беспрынцыпны буржуазны свет у вобразе Гартэнзіі канчаткова знішчае.

Максімальна натуралістычныя сцэны гібелі абедзвюх гераінь таксама маюць тыповы сэнс – і А. Адамовіч, і Э. Скобелеў паказалі ўсю непрыгожасць, амаральнасць забойства апошніх прадстаўнікоў чалавецтва, яго надзеі на лепшую будучыню:

Табліца 6. – Натуралістычнае апісанне смерці станоўчых гераінь твораў

| А. Адамовіч «Апошняя пастараль» | Э. Скобелеў «Катастрофа» |
|---|---|
| Залитые слезой, потухшие глаза, запавший, без зубов рот, шея и лоб в фиолетовых пятнах, какие-то клочья вместо волос на светящемся черепе – и это существо когда-то было женщиной? И вся она в гнилостных пятнах, о господи, даже не прикрыта ничем [3, с. 52]. | Я задушила Луийю. Ночью. Шелковым поясом от своего старого платья… Сопротивляясь, Луийя ударилась оперированной ногой о стальную стойку – всю постель забрызгала кровь… Потом меня рвало – здесь же, подле постели, на которой лежал теплый труп, – выпученные глаза и оскаленный рот [1, с. 167]. |

Апісанне сцэн гібелі Марыі і Луіі ашаламляе чытача жорсткасцю. Своеасаблівы прыём «шокавай тэрапіі» – выразныя крывавыя дэталі смерці Марыі ад радыяцыі і Луіі у выніку забойства прызначаны для таго, каб засцерагчы чалавецтва ад фатальных крокаў, паказаць адсутнасць прыгажосці і рамантычнасці ў вайне і смерці.

Вобраз Гартэнзіі, жонкі мастака Дутэншызера, не мае свайго прамога аналагу ў «Апошняй пастаралі». Распусная арыстакратка – гэта вобраз-сімвал, у якім сканцэнтраваны шматлікія сацыяльныя прычыны апакаліпсісу: катастрафічнае зніжэнне ўзроўню маралі, адчужэнне людзей нават у межах адной сям’і і інш. Катастрофа правакуе сутнасную радыкалізацыю поглядаў жанчыны на жыццё, робіць яе больш жорсткай і цынічнай. Знішчэнне чалавецтва, якое адбылося на яе вачах, дала Гартэнзіі адчуванне бязмежнасці свабоды, адсутнасці адказнасці за любыя, нават самыя дзікунскія ўчынкі. Яна не адчувае страху і сама вызначае свой стан як жывёльны: «Страха не было. Я была свободна как никогда. Упали человеческие лохмотья, я вновь стала зверем, как и остальные, кто был со мной, – оборвались нити, соединявшие людей со зловещей машиной социальной жизни. Упразднились запреты на желания – никаких запретов» [1, с. 163]. Даследчыца Л. І. Мурзіч лічыць, што пасля выратавання ад перажытых жахаў Гартэнзія страціла розум [2, с. 4]. Аднак усведамленне змен і іх цвярозае ўспрыманне сведчаць пра іншае: атамная вайна толькі вызваліла сапраўдную сутнасць жанчыны, вызваліла ад агульначалавечых табу, напрыклад, на забойства, і дала магчымасць праявіць свае першабытнажывёльныя якасці.

Яшчэ адным падобным элементам у абодвух творах з’яўляецца канцэпцыя пабудовы ізаляванага грамадства ў атамным сховішчы. Э. Скобелеў апісвае яе больш падрабязна, чым А. Адамовіч. Гэта тлумачыцца тым, што другая палова скобелеўскага твора прысвечана менавіта падзеям, якія адбываюцца за бетоннымі сценамі. Аўтар «Апошняй пастаралі» адводзіць апісанню ўмоў жыцця ў нейкім абстрактным сховішчы толькі адзін абзац. Аднак абодва пісьменнікі выбралі падобныя канцэпцыі для пабудовы жыцця ў сваіх мадэлях ізаляванага пад зямлёй постатамнага соцыуму.

Табліца 7. – Апісанне супрацьатамнага сховішча

| А. Адамовіч. «Апошняя пастараль» | Э. Скобелеў. «Катастрофа» |
|---|---|
| В том гранитно-стальном гробу, так здорово задуманном, сконструированном, построенном для долгой жизни с замкнутым циклом обращения веществ (растения должны были поглощать углекислоту, а человеческие фекалии питать растения), очень скоро сами люди превратились или в надсмотрщиков-палачей, или в лагерную чернь, истребляемую поголовно. Со все большей лютостью надсмотрщики охотились за всеми, а потом уже и друг за другом [3, с. 32]. | Забегая вперед, скажу, что инструкция оказалась, однако, бесполезной для самого существенного – для налаживания новых отношений между людьми. Этого нельзя было достичь на принципах общества, построившего убежище: его мораль и философия остановились на уровне всеобщей вражды и разделения людей на тех, кто господствует и преобладает, кто подчиняется и лишен влияния [1, с. 141]. |

Выразна бачна, што абодва пісьменнікі аднолькава ўяўляюць тыповае супрацьатамнае сховішча, асноўныя прынцыпы яго існавання і тыя праблемы, з якімі можа сутыкнуцца насельніцтва бункера.

Паводле думак абодвух мысляроў, людзі страцілі свой рай і пабудавалі замест яго сурагат. Аднак ён не здолеў замяніць ім нават жыццё на Зямлі ў даваенны перыяд. Гэта адбылося перш за ўсё з-за катастрафічнага падзення маралі, знікнення былых забаронаў, якія стрымлівалі людзей ад татальнага знішчэння адзін аднаго. І Э. Скобелеў, і А. Адамовіч сыходзяцца ў думках, што выратавацца пасля ядзернага апакаліпсісу чалавецтва не зможа, нават пабудаваўшы ўмацаваныя і забяспечаныя ўсім неабходным сховішчы. Гэтым яшчэ раз да чытача пераканаўча даводзіцца ідэя, што вайну можна папярэдзіць, аднак яе наступствы будуць катастрафічнымі і непапраўнымі.

Па Э. Скобелеву, пасляядзернае існаванне немагчыма без карэннай змены прыярытэтаў чалавечага жыцця. Аўтар «Катастрофы», як і А. Адамовіч, перакананы, што шлях да выратавання ляжыць праз змену поглядаў на месца самога чалавека ў свеце, яго ўспрыманне прыроды і іншых людзей. Інакш, як мы ўжо пазначалі, ні выратаваць цывілізацыю, ні адбудаваць яе пасля армагедону, будзе немагчыма, паколькі «его мораль и философия остановились на уровне всеобщей вражды и разделения людей» [1, с. 141].

**Заключэнне**

«Апошняя пастараль» і «Катастрофа» – творы выбітныя для свайго часу. Іх стваральнікі, кіруючыся агульначалавечымі каштоўнасцямі і гуманістычнымі прынцыпамі пераканаўча давялі да чытацкай аўдыторыі небяспеку некантралюемага распаўсюджвання атамнай зброі і яе знаходжання ў руках людзей з поўнай адсутнасцю маральных прынцыпаў. Аповесць і раман маюць шмат кропак судакранання: галоўная ідэя твора, роднасныя вобразы Марыі і Луіі, агульны погляд на спосаб выратавання чалавецтва, падобныя сістэмы эвалюцыі герояў, выяўленне іх характараў не толькі праз ўчынкі, але і праз доўгія філасофскія маналогі. Між тым ёсць і несупадзенні. Напрыклад, Э. Скобелеў выкарыстоўвае тыповы для савецкай літаратуры прыём дэманізацыі заходняй палітычнай сістэмы і абвінавачвання ў развязванні гіпатэтычнай Трэцяй сусветнай вайны А. Адамовіч, нягледзячы амаль на ідэнтычны час стварэння сваёй аповесці, адыходзіць ад гэтага прынцыпа, абвінавачваючы ўсё чалавецтва ў атамнай катастрофе і адначасова звяртаючыся з палымяным заклікам не дапусціць апакаліпсісу абодвума бакамі магчымага канфлікту. І А. Адамовіч, і Э. Скобелеў сваёй творчасцю прапагандуюць ідэю агульнай адказнасці чалавецтва за агульную будучыню.

Навуковая навізна нашага даследавання – у комплексным параўнанні дзвюх найбольш значных беларускіх «атамных утопій» і выяўленні іх маральна-філасофскай канцэптуальнасці.

Атрыманыя ў выніку працы над артыкулам тэарэтыка-практычныя дадзеныя могуць выкарыстоўвацца студэнтамі, магістрантамі і выкладчыкамі ў такіх дысцыплінах, як «Гісторыя беларускай літаратуры», «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Асновы тэорыі літаратуры» і г. д.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Скобелев, Э. М. Катастрофа [Электронный ресурс] / Э. М. Скобелев // Электронная библиотека RoyalLib.com. – 2020. – Режим доступа: https://royallib.com/read/skobelev_eduard/katastrofa.html#0/. – Дата доступа: 29.04.2020.
2. Мурзич, Л. И. «Катастрофа» Э. М. Скобелева как роман-предостережение / Л. И. Мурзич // Русскоязычная литература Беларуси конца XX – начала XXI века : сб. науч. ст. – Минск : РИВШ, 2010. – С. 10–15.
3. Адамович, А. Последняя пастораль [Электронный ресурс] / А. Адамович // Электронная библиотека RoyalLib.com. – 2020. – Режим доступа: https://royallib. com/book/adamovich_ales/poslednyaya_pastoral.html. – Дата доступа: 17.03.2020.
4. Айтматов, Ч. И дольше века длится день [Электронный ресурс] / Ч. Айтматов // Электронная библиотека Loveread. – 2020. – Режим доступа: http://loveread.ec/read_book.php?id=187&p=1. – Дата доступа: 29.04.2020.
5. Адамович, А. Каратели: Радость ножа, или Жизнеописания гипербореев / А. Адамович. – Минск : Попурри, 2014. – 368 с.


*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 21.10.2020*